**М. С. Рагачэўская**

# НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА: ДУХОЎНАЯ ПРОЗА

XXI стагоддзе адкрыла новую эпоху ў культурным і цывілізацыйным жыцці. Стагоддзе рухаецца з хуткасцю электроннага сігналу, і пад гэту хуткасць падстройваецца і творчы працэс. Гэта значыць, што тыя новыя рэаліі, што з'явіліся ў паўсядзённым жыцці, у палітычных рухах, у тэхналогіях і навуцы, патрабуюць нейкага новага дыскурсу, асэнсавання ў межах тэкстуальнасці.

Постмадэрнісцкая парадыгма для свайго часу служыла выдатным адлюстраваннем працэсаў калектыўнай свядомасці, дзе былі акцэнтаваны множнасць светапоглядных сістэм, іранічнае расчараванне сусветам, імкненне да найбольшай "інклюзіі" ўсяго іншаснага, асабліва маргіналізаванага ў мінулым. Інтэрпрэтацыя постмадэрнісцкіх твораў апрыёры ўтрымлівала ў сабе адмову ад нейкіх выразных імператываў, маральных арыенціраў ці дыдактычных установак.

Аднак з надыходам новага тысячагоддзя паступова стала зразумелым, што вяртанне да рэчаіснасці, пошук тых самых арыенціраў, што яшчэ дзесяцігоддзе таму лічыліся рэлятўнымі, – неабходныя крокі, і дыктуюцца яны менавіта рэальнымі падзеямі.

Беларуская літаратура, якая на працягу XX ст. рухалася ўслед за сусветнай з пэўным адставаннем, напрыканцы таго ж стагоддзя раптоўна ўлілася ў постмадэрнісцкую плынь і адзначылася творамі такіх аўтараў, як А. Глобус, В. Марціновіч, А. Брава, А. Хадановіч, Ю. Барысевіч, В. Жыбуль, С. Мінскевіч, А. Туровіч, З. Вішнёў ды інш.

Так, у нашай нацыянальнай літаратуры постмадэрнізм як напрамак не прыйшоў услед за мадэрнізмам ці трансфармаваным сталым рэалізмам XX ст., альбо неамадэрнізмам, як гэта характэрна для літаратур Еўропы, а ўзнік амаль пасля сацыялістычнага рэалізму. У выніку ў беларускай літаратуры канца XX – пачатку XXI ст. суіснавала некалькі напрамкаў: новы рэалізм, неарамантызм, мадэрнізм, постмадэрнізм. Як адзначаў П. Васючэнка, постмадэрнізм – гэта не ўласна стыль ці кірунак, але ўніверсальная гісторыка-культурная сітуацыя мяжы XX—XXI ст., "зьвязаная з адчуваньнямі пераходнасьці, крызыснасьці, вычарпанасьці быцьця".

Калі ж ступень пераходнасці аказваецца пройдзенай, ідзе новы пошук стабільнага і больш заземленага. Маючы моцныя маральна-дыдактычныя традыцыі, беларуская літаратура 2000–2020 гг. зноў звярнулася да так званай "духоўнай" паэзіі, узнаўляючы традыцыі Казіміра Сваяка, Рыгора Барадуліна, Зніча (Алега Бембеля). Што тычыцца непасрэдна жанру "духоўнай прозы", класічнае яго вызначэнне супадае з паняццем "рэлігійная проза", а яе пачынальнікам лічыцца Кірыла Тураўскі, аўтар твораў рэлігійна-царкоўнай тэматыкі.

З цягам часу, асабліва ў перыяд панавання камуністычнай ідэалогіі, гэты накірунак зышоў у амаль поўнае небыццё, не ўлічваючы асобных праяў матываў духоўнай нарацыі ў рамане У. Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1972).

Тым не менш калектыўная памяць і хрысціянскія традыцыі ў беларускім пісьменстве пачынаюць адраджацца менавіта ў XXI ст. Цікавым прыкладам існавання такой новай духоўнай прозы можна лічыць зборнік апавяданняў Алеся Ветаха (Бельскага) "Хрыстос між нас" (2015). Кніга складаецца з невялічкіх, розных па спалучэнні рэалізму і фантастыкі твораў, аб'яднаных хрысціянскімі матывамі.

Апавяданні, нарысы, белетрызаваныя мемуары, паўаўтабіяграфічныя нататкі – так можна вызначыць жанравыя варыяцыі твораў малой прозы, што складаюць зборнік. Сярод іх найбольш выразна вылучаюцца апавяданні, якія адлюстроўваюць загаловак усёй кнігі: "Ноч перед Вялікаднем", "Хрыстос між нас", "Астравок восеньскай самоты". Гэтыя тэксты будуюцца на алюзіўным увасабленні фігуры Хрыста, эгзегетычным архетыпе. Так, у першым узгаданым апавяданні вачыма хлопчыка Рыгоркі ўбачана карціна хросту дзяцей у савецкі час. Яго маці Люба вырашыла пахрысціць сыноў і дачку насуперак забаронам, употай, каб не нашкодзіць партыйнаму мужу.

Увесь абрад хрышчэння апісаны ў апавяданні як нешта цудоўнае, як каштоўнае набыццё, у выніку якога набываецца не толькі анёл-ахоўнік, але і нейкая новая якасць душы, свядомасці. Вобраз Рыгоркі паволі праходзіць мастацкую трансфармацыю: на пачатку тэксту ён просты сялянскі хлопчык, нічым не прыкметны, паслухмяны і ўважлівы. З прыходам у царкву разам з маці і малодшымі дзецьмі Рыгорка сапраўды адчувае на сабе нешта незвычайнае, ён уражаны выявамі святых у храме, веліччу ўбранства царквы.

Але асноўнае, што цалкам перастварае зямнога хлопчыка ў іпастась Ісуса Хрыста, гэта драматычны эпізод яго барацьбы са злом, за выратаванне сляпога сабакі, якога вось-вось жорстка знішчаць старэйшыя вясковыя хлопцы-браты з сімвалічным прозвішчам Пілат. Замест Тузіка праз сваё спачуванне да безабароннай істоты ахвярай становіцца сам Рыгорка.

Аўтар малюе кульмінацыйную сцэну ў згушчана сімвалічных фарбах: Рыгорку прывязваюць да тэлеграфнага слупа, падобнага на крыж, разбіваюць твар у кроў, якая залівае белую кашулю, што была адзета на хрышчэнне, а шкельцам ад разбітай бутэлькі раняць Рыгоркавы далоні. Як і Хрыста, з "крыжа" Рыгорку здымае Марыя – нібыта сама Магдалена – але па прозвішчы Мяцельская. Такім чынам адбываецца новае "прышэсце" справядлівасці, міласці, самаахвярнасці і спачування жывому і безабароннаму на грэшнай зямлі – праз просты вобраз маленькага і недарэчнага чалавечка.

У другім узгаданым апявяданні фантасмагарычнасць набывае больш інтэнсіўнае ўвасабленне – праз постаць доўгабародага, босага і зморанага вандроўніка: "…ці то валацуга, ці то нейкі непрыкаяны". Сюжэт апавядання пабудаваны на адным цэнтральным здарэнні: з прыходам на сялянскі двор незнаёмага дзіўнага чалавека адбываецца тварэнне цуда – збаўленне дванаццацігадовай дзяўчынкі Волькі ад кульгавасці пасля таго, як атрымаўшы ад дзяўчынкі кубак вады, падарожны чытае над ёй малітву і творыць цуд.

Такі эпізод носіць выразна містычны характар, прасякнуты сімволікай і ўтрымлівае біблейскую цытацыю. Аднак на гэтым апавяданне не заканчваецца, таму што паўната і завершанасць мастацкага пераўвасаблення фігуры Хрыста можа быць рэалізавана толькі ў паралелі з біблейскай гісторыяй, дзе Хрыстос аказваецца на крыжы побач з двума асуджанымі злодзеямі.

У гісторыі Ветаха, дзе падзеі адбываюцца ў савецкі час, ролю жаўнераў Понція Пілата выконваюць міліцыянеры, якія маюць загад затрымаць гэтага валацужніка, "багамольца барадатага", "прарока хрэнава" і разам з двума "зладзюгамі" адправіць у каталажку. Гэта тытульнае апавяданне служыць стрыжнем для ўсёй кнігі і завяршаецца радком: "Хрыстос паміж нас і ў кожным з нас".

Трэцяя з разгледжаных гісторый мае зусім іншую жанравую скіраванасць – гэта кароткі нарыс-эпіфанія, дзе таксама сцвярджаецца максіма "Гасподзь усюды і паўсюль". Гэты нарыс мае рамачную структуру: маляўнічае апісанне дубовага гаю, яго восеньскага харастава, яго таямнічай моцы, з цэнтральным вобразам агромністага дуба-волата, што мае дзіўную крыжападобную форму, утрымлівае ў сваім багатым наратыве ўзгадку пра гвалтоўную смерць юнака, што адбылася на памяці апавядальніка і адгукнулася ўспамінамі праз з'яўленне аблічча Хрыста перад дзівосным дубам-крыжам. І хоць мікрааповед не мае сваіх структурных складнікаў, менавіта ён парушае нейкую чаканую логіку, на якой будуюцца іншыя апавяданні зборніка, бянтэжыць чалавечае спадзяванне на нейкую найвышэйшую справядлівасць, нагадвае пра тое, што шляхі Госпада неспазнаныя, што смерць не гуляе па правілах. Лірычная замалёўка, што стварае абрамленне для сумнай падзеі, ператвараецца з эпіфаніі – раптоўнага прасвятлення і зведвання чагосьці надзвычай важнага – у нарыс-эпітафію, калі нібыта сам дубовы гай і дрэва-крыж пішуць адвечны верш тугі і смуты праз восеньскі лістапад.

Узнаўленне і далейшае развіццё духоўнай прозы ў беларускай літаратуры XXI ст. – гэта заканамерны вынік таго неспакойнага хістання ў паўсюднай постмадэрнісцкай рэлятыўнасці і "смерці аўтара". Новая духоўная проза

Алеся Ветаха характарызуецца спалучэннем рэалістычнай і магічнай дэталяў, матываў звычайнасці і фантасмагорыі, узвышанага адчування нябеснай сілы, сузірання ліку Хрыста і абсалютнага ўвасобленага зла, а таксама, з боку формы – разнажанравасцю, свабодай наратыўных прыёмаў, глыбокім псіхалагізмам, што рэалізуецца як праз фенаменалагічны ракурс, так і праз аналітычны яго складнік.